№ 5-6 (57-58)
Февраль 2009 г.

Глуская ПАНОРАМА

Общественно-политическая газета

16 лет назад в Глуске произошли события, которые в некоторых средствах массовой информации были названы «бархатной революцией». Голодовка, митинг протеста, создание районного комитета общественного самоуправления, попытка проведения районного референдума о доверии местной власти, создание районной организации БНФ... Все это было в 1992 году. Этим знаменательным событиям посвящается данный номер газеты.

ГЛУССКИЙ РАЙОННЫЙ КОМИТЕТ ОБЩЕСТВЕННОГО САМОУПРАВЛЕНИЯ

(продолжение)

Я СТРОИТЬ НЕ БУДУ...

(Из выступления председателя Глусского райисполкома В.В.Щетько на собрании жителей района в кинотеатре «Орион» 2 февраля 1992 г.)

...Раз такое волнение идет, кто подумал, что Щетько строит — это вы неправы. Щетько не начал строить, к вашему сведению, но уже взял участок земли. Я говорю, как оно есть, и хотел было строить за свои деньги, получить, как все любые. У меня сегодня никто не прописан в моей квартире, вы это прекрасно знаете, и хотел строить за свои деньги, потому что все равно мне придется эту квартиру выкупить. Все равно мне за нее, наверное, тысяч тридцаць придется заплатить. Поэтому, вот тут я вижу со Славкович присутствуют представители, я вижу, сидит целый ряд, я жил в этом колхозе, держал коров, держал поросенка, держал кур. Значит, сегодня такой возможности нет. Я всем за время своей работы жителям Глуска и по земле вопросы решались и, повторяю, что по сарайчикам во многих местах решали, на «Семи ветрах» решаем, и по другим вопросам. Просто непросто в следующем году даже при моей зарплате прожить в этих домах трудно. Я повторяю, что еще от батьки привожу кроликов, и картошку от батьки вожу от своего. Поэтому есть вопросы, но раз так вопрос стоит, раз именно вопрос заострен по Щетько, я повторяю, строить никто не начинал. Я строить не буду, раз так народ требует, значит. Но одно только хочу сказать для других: тот, кто хотит за свои личные деньги строить, он имеет право строить и пусть строит. Это будет неправильно...

«Панарама» № 45, лістапад 1993 г. (дадатак да газеты «Ратуша»)



В. Щетько выступает на собрании пайщиков в кинотеатре «Орион». 2.02.1992. Фото В. Медведева.

У райвыканкоме

АТРЫМАЎ ПУЦЁЎКУ Ў ЖЫЦЦЁ

Раённая газета паведамляла ўжо сваім чытачам аб тым, што ў Глуску на сходзе пайшчыкаў раёна, які праводзіўся пасля вядомага ўсім мітынгу ў Глуску, быў створан грамадскі камітэт. Крыху пазней больш чотка акрэсліліся напрамкі яго дзейнасці, адпаведнасць заканадаўчым

актам рэспублікі, і новая грамадская арганізацыя атрымала статус раённага камітэта грамадскага самакіравання. Сумесным рашэннем прэзідыума і выканкома раённага Савета народных дэпутатаў нядаўна зацверджана часовае палажэнне аб даным камітэце.

У адпаведнаіці з дзеючым заканадаўствам камітэт, які ўтворан на аснове добраахвотнага волевыяўлення грамадзян, ажыццяўляе сваю дзейнасць у цеснай сувязі з мясцовымі Саветамі, іх органамі, народнымі дэпутатамі, працоўнымі калектывамі, грамадскімі арганізацыямі ва ўмовах шырокай галоснасці. Каардынуе гэтую дзейнасць раённы Савет народных дэпутатаў і яго выканком.

У палажэнні вызначаны правы і абавязкі раённага камітэта грамадскага самакіравання. Ён надзелен статусам юрыдычнай асобы, мае асобны рахунак у банку, можа кааперавацъ добраахвотныя ўзносы і ахвяраванні грамадзян і арганізацый. Яму прадастаўлена права звяртацца з прапановамі ў мясцовыя Саветы і іх органы, прадпрыемствы і ўстановы і ўдзельнічаць у іх разглядзе, ажыццяўляць грамадскі кантроль за іх работай. Па ўзгадненню з выканкомам райсавета камітэт можа ствараць камісіі для рашэння неабходных пытанняў з прыцягненнем кампетэнтных спецыялістаў, арганізоўваць правядзенне неабходных экспертыз.

Ен мае права заслухоўваць інфармацыю і прымаць меры грамадскага ўздзеяння да службовай асобы, якая дапусціла злоўжыванне ў сваёй рабоце, шляхам абмеркавання яе дзеянняў на пасяджэнні камітэта або на сходзе данага працоўнага калектыва. У неабходных выпадках можа накіроўваць матэрыялы ў адпаведныя кампетэнтныя органы для прыцягнення да адміністрацыйнай або крымінальнай адказнасці.

Члены раённага камітэта грамадскага самакіравання сумесна з прадстаўнікамі органаў дзяржаўнай улады і кіравання маюць права знаёміцца са справаздачнай або іншай дакументацыяй прадпрыемстваў і арганізацый, па пісьмоваму даручэнню камітэта адміністрацыя не мае права перашкаджаць яе прадастаўленню.

Члены камітэта маюць права прысутнічаць на пасяджннях выканкомаў і сесій мясцовых Саветаў народных дэпутатаў.

Рашэнні камітэта носяць растлумачальны і рэкамендацыйны характар.

Палажэннем абумоўлена і сацыяльная абароненасць членаў камітэта. У прыватнасці, яны могуць вызваляцца ад сваёй асноўнай работы з захаваннем сярэдняга заработку на перыяд выканання імі даручэнняў камітэта, калі наконт гэтага ёсць рашэнне адміністрацыі і прафсаюзнага камітэта або працоўнага калектыва.

Члену раённага камітэта грамадскага самакіравання выдаецца пасведчанне.

Дэфіцыт газетнай плошчы не дае магчымасці апублікаваць цалкам часовае палажэнне аб раённым камітэце грамадскага самакіравання. Жадаючыя маюць магчымасць пазнаёміцца з ім дэталёва ў самім камітэце, які размяшчаецца часова ў зале пасаджэнняў райвыканкома.

«Радзіма» № 18 4.03.1992

«ЧП» РАЁННАГА МАШТАБУ

Мясцовыя вастрасловы жартуюць: «У Глуску ўсё не па-людску». Маўляў, нашыя людзі любяць на фоне іншых выдзеліцца. Зрэшты, у святле апошніх тут падзей з гэтым нельга не пагадзіцца. Глуск і сапраўды у канцы студзеня прагрымеў на ўсю рэспубліку. Шмат якія сродкі масавай інфармацыі паведалі аб факце галадоўкі тутэйшага жыхара Віктара Вярыгі, які абвясціў яе на гарадской плошчы у знак пратэсту супраць «гандлёвага самавольства» і «цэнзуры у раённым друку».

Сыр-бор разгарэўся вось з-за чаго. Віктар Вярыга, малады вадзіцель глускай службы гаргазу, за апошнія паўгода не атрымаў у магазіне вёскі Калацічы, дзе ён пражывае, сваю норму спіртнога, а у раённым каапнарыхтоўпраме міксер за здадзенае туды мяса. Ён лічыць, што віной таму - дзеянні калаціцкага заўмага Надзеі Верабей, старшыні райспажыўсаюза Рыгора Папкова, дырэктара каапнарыхтоўпрама Леаніда Шарко. Пра гэта Вярыга напісаў артыкул у раённую газету, але тая яго не змясціла. І тады вадзіцель пайшоў на крайнюю меру...

Вынікам яго акцыі пратэсту стаў агульнараённы мітынг, які з мэтай разрадкі грамадскага становішча быў скліканы старшынёй райвыканкама Віктарам Шчэцькам, дзе праца гандлёвых арганізацый спажывецкай кааперацыі атрымала вельмі негатыўныя водгукі. Самай агрэсіўнай абструкцыі з боку выступаючых было падвергнута раённае кіраўніцтва гандлем. Да пералічаных вышэй асоб своеасаблівымі персонамі «нон грата» на кіруючыя пасады у Глуску былі далучаны і аб'яўлены намеснік старшыні райспажыўсаюза Алена Аўчыннікава і намеснік старшыні райвыканкама Людміла Клыга. «Народнае веча», у якім прыняло ўдзел некалькі тысяч чалавек, утварыла у той дзень спецыяльны грамадскі камітэт па расследаванню злоўжыванняў службовым становішчам адказных работнікаў раёна. У склад выбранага камітэта, акрамя ужо вядомага Вярыгі, увайшло яшчэ 13 найбольш актыўных публічных выкрывальнікаў «гандлёвай мафіі»...

Такі кароткі пераказ гэтай, будзем шчырымі, сумнай і малапрыемнай гісторыі. «Ці была яна непазбежнай?» - услед падзеі задаюцца пытаннем сёння многія тут жыхары, а найперш работнікі спажывецкай кааперацыі, чый грамадскі аўтарытэт, па ўласнаму меркаванню, упаў да вельмі нізкага ўзроўню. І сапраўды, ці была?

Добры дзесятак-другі сустрэч на глускай зямлі, пад час нядаўняй сюды камандзіроўкі, з людзьмі самых розных прафесій і ўзростаў, ад калгасных пенсіянераў да старшыні райвыканкама, схіляе мяне да адмоўнага заключэння. З другога боку, нават павярхоўны аналіз дзейнасці раённай службы гандлю райспажыўсаюза, яе кіраўнікоў сведчыць аб амаль поўнай адсутнасці інстын-

кту самазберажэння у маючых сёння месца экстремальных эканамічных і сацыяльных умовах. Урэшце, давайце паразважаем.

Як ні парадаксальна, але мандат «народнага героя» Вярыга атрымаў з рук... саміх работнікаў спажывецкай кааперацыі. Ні Папкоў, ні Шарко, ні Верабей, на чым шляху ён так ці інакш аказваўся, не разгледзелі, як след, «змагара за справядлівасць». Між тым, адметнасць яго - у змаганні выключна за ўласныя інтарэсы, а не, скажам, вясковага суседа ці гарадскога таварыша па рабоце, што легка ўгадваецца з надрукаванага пазней у раёнцы таго злашчаснага артыкула пра «гандлёвую мафію». Зрэшты, пацвердзіў гэта і лютаўскі сход пайшчыкаў вёскі Калацічы, які абсалютнай большасцю галасоў выказаўся супраць патрабаванняў вадзіцеля гаргазу аб зняцці з пасады заўмага Верабей.

Але няўважлівасць адказных службоўцаў райспажыўсаюза да грамадзяніна Вярыгі была не адзінай іх памылкай. Тыя, асабліва у апошні час, нібыта ільдзіны у вясновы крыгаход, наслойваліся адна на другую. Самай спрыяльнай глебай для гэтага зрабіўся таварны дэфіцыт.

Блізкасць вогнішча выклікае, як вядома, прыцягальнае жаданне пагрэць над полымем рукі. Знаходжанне ля міксераў ці гарэлкі, не кажучы пра тэлевізары ды халадзільнікі, попыт на якія у шмат разоў перавышае задавальненне, не менш спакуслівa ўздзейнічае на чалавечыя пачуцці. Аспрэчваць гэта возьмецца далека не кожны гандляр дэфіцытаў. Разам з тым, тут, як нідзе больш, і найлепшае месца для існавання спадара Року...

Менавіта Рок, ёсць такое меркаванне, абышоўся непачціва з глускім райспажыўсаюзам. Не вытрымала яго служба гандлю выпрабавання ўмовамі вострага тавapнага голаду. Функцыі размеркавання сярод насельніцтва прадукцыі хворай савецкай эканомікі аказаліся ей не пад сілу. Асобныя выпадкі злоўжывання службовым становішчам мясцовых работнікаў гандлю, падагуленыя на мітынгу, аказалі рашаючы ўплыў на грамадскую думку.

Прынамсі, наіўна было б спадзявацца на іншы ход падзей, на тое, што абыйдзе яна маўчаннем, напрыклад, паводзіны загадчыцы магазіна «Дзіцячы свет» Шабанавай, якую супрацоўнікі міліцыі затрымалі нядаўна пры вынасе дэфіцытных рэчаў на многія сотні рублёў. Або абыякава пройдзе міма факта частых паездак тутэйшых работнікаў прылаўка у суседнюю Польшчу, куды, як вядома, рэдка хто едзе з пустымі рукамі. Словам, шмат папрокаў (дарэчы, як справядлівых, так і выдуманых) у свой бок давялося прынародна пачуць ад пайшчыкаў службоўцам райспажыўсаюза, асабіста яго кіраўніку Папкову, якому прыгадалі, у прыватнасці, выкупленую у роднай арганізацыі «Волгу»...

Рыгору Емяльянавічу тут сёння, бадай, цяжэй за ўсіх. У сувязі з нездаровай грамадскай думкай, якая склалася вакол яго імя, быў ён вымушаны падаць у адстаўку. Праўда, канчатковае рашэнне па яго асобе, згодна статуту спажывецкіх таварыстваў, павінен прыняць савет раённай арганізацыі, пасяджэнне якога адбудзецца 6 сакавіка.

Зразумела, наперад складана загадваць пра характер будучага сходу. Тым не менш, будзем спадзявацца, што ён не абыйдзецца без дэталёвага аналізу папярэдняга шляху Глускага райспажыўсаюза, што прывёў да «ЧП» раённага маштабу.

Міхась СТЭЛЬМАК
«Рэспубліка» 6.03.1992

БЕЗОБРАЗИЯМ КОНЕЦ?

В Глуске в кинотеатре «Орион» прошло необычное собрание пайщиков райпотребсоюза. На нем был создан общественный комитет по рассмотрению злоупотреблений служебным положением некоторых руководителей района.

— Время теперь нелегкое,— рассказывает член комитета учительница СШ № 1 Дина Григорьевна Рудник. — Нельзя без возмущения смотреть на безобразия, которые до недавней поры творились в торговле. В продаже ничего нет, а выручка сдавалась большая, много товаров работники торговли вывезли в Польшу. В районе крайне плохо решается жилищная проблема, а для избранных строятся великолепные индивидуальные усадьбы.

Комиссия утверждена исполкомом. Теперь она имеет право проводить проверки, знакомиться с документами и т. д. У общественников большие планы: уже вскрыты факты, которые, безусловно, будут сенсацией для жителей района. Мы, в свою очередь, постараемся рассказать о них читателям.

Соб. инф.
«Советская Белоруссия» 6.03.1992

ВОЗВРАЩАЯСЬ К НАПЕЧАТАННОМУ

«БЕЗОБРАЗИЯМ КОНЕЦ?»

Под таким заголовком 6 марта мы рассказали о нашумевших событиях в Глуске: недовольстве населения, злоупотреблениях некоторых руководителей района, безобразиях в системе торговли. Комитету общественного самоуправления было поручено во всем детально разобраться. Воодушевленные поддержкой исполкома энтузиасты горячо взялись за дело, но столкнулись с массой проблем: им не дали ознакомиться с документами, чинили всяческие препятствия. Тем не менее «раскопать» удалось немало.

Заведующая отделом культуры райисполкома Г. М. Кожушко и главный бухгалтер З. П. Пулинович выкупили жилые дома, которые строил отдел. Выкупили со скидкой 70 процентов затраченных на строительство средств. Вскрыты отклонения от проекта, оказались заниженными затраты на строительство и соответственно — цена выкупа. Г. Кожушко, например, за домину общей площадью 180 кв.м уплатила... 8 тысяч рублей.

— Под давлением общественности сессия райсовета освободила ее от занимаемой должности, - рассказывает член комитета самоуправления учительница средней школы № 1 Д. Г. Рудник. — К сожалению, даже на сессии нам меша-

ли. Дошло до того, что некоторые депутаты возражали против нашего присутствия на заседании, предлагали вывести из зала под конвоем. Фарсом стало выступление председателя райпотребсоюза Г. Е. Попкова. Послушаешь его: все хорошо и прекрасно. А ведь весь сыр-бор разгорелся именно из-за злоупотреблений в торговле. Не приняты меры воздействия к другим проштрафившимся руководителям, проигнорированы наши рекомендации и предложения. И неудивительно: круговая порука. Но пасовать мы не намерены...

Страсти в районе по-прежнему накалены. 29 марта комитет общественного самоуправления проводит митинг.

Анатолий Зельдин.
«Советская Белоруссия» 28.03.1992

СЕСІЯ РАЁННАГА САВЕТА НАРОДНЫХ ДЭПУТАТАЎ

...Ад раённага камітэта па грамадскаму самакіраванню М. І. Малаковічам, а затым і дэпутатам М. У. Падлужным была ўнесена прапанова ўключыць у павестку дня сесіі пытанне “Аб вызваленні ад займаемай пасады намесніка старшыні райвыканкома Л. А. Клыга».

Аднак дэпутаты Ю. Ф. Былінскі, М. Ф.Валодзька, П. В. Еўпак адхілілі гэтую прапанову, выказаўшы сумненне ў правамоцтве створанага камітэта, паколькі на сходзе грамадзян, дзе ён выбіраўся, адсутнічалі прадстаўнікі многіх працоўных калектываў. Невядома, як праходзіла дэлегіраванне прадстаўнікоў, хто вызначаў іх колькаснае прадстаўніцтва, і, нарэшце, дэпутаты не маюць якіх небудзь кампраметуючых дакументаў, каб зараз выносіць падобнае пытанне на абмеркаванне.

Гэтую ж думку выказаў і старшыня раённага Савета В. У. Шчэцька. Кіравацца толькі эмоцыямі і чуткамі мы не маем права, сказаў ён. Членам камітэта прапаноўвалася неаднаразова прад'явіць доказы віноўнасці Л. А. Клыга, але да гэтага часу яны не прадстаўлены.

Пастаўленая на галасаванне, гэтая прапанова не набрала патрэбнай колькасці галасоў і была адхілена дэпутатамі.

Інцыдэнт тым не менш быў, заявіў дэпутат А. П. Курс, і яго патрэбна абмеркаваць.

Была дасягнута дамоўленасць аб тым, каб пастаяннай камісіі райсавета па гандлю, бытавому абслугоўванню і грамадскаму харчаванню сумесна з камітэтам грамадскага самакіраваныя падрыхтаваць гэтае пытанне, разгледзець яго на прэзідыуме і вынесці на чарговую сесію.

Па просьбе членаў камітэта грамадскага самакіравання ім было дазволена весці магнітафонны запіс ходу сёсіі...

“Радзіма” 18.03.1992 № 22

РАЗЛІЧВАЕМ НА ПАДТРЫМКУ

Напэўна, многім вядома, што адносна нядаўна ў раёне на сходзе пайшчыкаў і грамадскасці быў створан раённы камітэт грамадскага самакіравання. За гэты час было распрацавана і зацверджана палажэнне камітэта, якое было часткова надрукавана ў газеце «Радзіма». Адкрыты таксама разлікові рахунак у Глускім Аграпрамбанку.

Члены камітэта працуюць на грамадскіх пачатках. Аднак, зразумела, любая праца, каб яна была дзейснай, патрабуе пэўных грашовых сродкаў. Іх жа на сённяшні дзень яўна недастаткова. Таму камітэт грамадскага самакіравання звяртаецца да кіраўнікоў гаспадарак, прадпрыемстваў і арганізаціый раёна, насельніцтва з просьбай аб матэрыяльнай дапамозе: грашыма ці якімі іншымі сродкамі. Пажадана, каб у бліжэйшы час на сваіх сходах працоўныя калектывы вылучылі сваіх прадстаўнікоў у грамадскі камітэт. Больш поўнае прадстаўніцтва ў ім дапаможа і больш поўна прадстаўляць інтарэсы людзей.

У сувязі з гэтым лічым мэтазгодным нагадаць, што зараз камітэт грамадскага самакіравання збіраецца ў зале пасяджэнняў райвыканкома па нядзелях у 9 гадзін раніцы, як і тое, што разлікові рахунак камітэта 000609218 у Аграпрамбанку г. п. Глуск.

Пакуль не ўстаноўлен пастаянны адрас камітэта, жадаючыя, калі ўзнікне такая неабходнасць, могуць пісаць па адрасу: вузел сувязі, а/я № 1.

Чакаем вашых пісьмаў і прапаноў.

Раённы камітэт грамадскага самакіравання.
«Радзіма» 1.04.1992

Вяртаючыся да надрукаванага

ШТО АДБІЛАСЯ Ў ЛЮСТРЫ?

У канцы студзеня ціхую ўскраіну Магілёўшчыны — Глуск — ускалыхнула небывалая падзея: сядзячая галадоўка ля будынка райвыканкома вадзіцеля мясцовай газавай гаспадаркі, а таксама яго пагроза ў выпадку невыканання патрабаванняў публічна спаліць сябе, пакінуць сіротамі двух малалетніх дзяцей, а жонку — удавой.

Нечакана, мажліва, толькі для мясцовых улад, да пратэстуючага далучыліся шматлікія глушчане, і ў выніку галадоўка вадзіцеля вылілася ў мнагалюдную «разборку» з уладамі на мітынгу. Аб гэтым «МП» расказвала ў рэпартажы «Глуск як люстра новай рэвалюцыі?» (№ 18 за 1 лютага г.г.).

Як пісаў паэт, «той ураган прайшоў». І мы вырашылі вярнуцца да тых падзей, каб прасачыць іх вынікі сёння.

Калі памятае чытач, галоўным патрабаваннем на мітынгу стала змяшчэнне з пасад старшыні праўлення райспажыўсаюза Р. Е. Папкова, яго намесніка па гандлю А.С.Аўчыннікавай, намесніка старшыні райвыканкама Л. А. Клыга. Тады раённае кіраўніцтва ў асобе старшыні райвыканкама В. У. Шчацько шукала кампраміс, імкнулася збіць мітынговы запал. У прынцыпе, імкненне правільнае. Бо калі б усё можна было так проста вырашаць на мітынгах, не клапоцячыся аб законнасці вынасімых рашэнняў… Чаго прасцей: сабраліся і «прыгаварылі». Тады раённы «галава» пабаяцаў ва ўсім дэталёва разабрацца, паступіць і па справядлівасці, і

па закону. Прапанаваў тут жа адразу стварыць сумесныя з грамадскасцю камісіі. А выйшла...

У выніку бурных дэбатаў ужо ў кінатэатры (на вуліцы прыціскаў маразок) з'явіўся камітэт грамадскага самакіравання. Назваць падобнае фарміраванне можна па рознаму. Справа не ў назве. Галоўнае, роля і функцыі гэтага камітэта - тыповага дзіцяці мітынговай дэмакратыі — застаюцца не зусім зразумелымі. Лагічна разважаючы, калі камітэт — орган, альтэрнатыўны раённаму і пасялковаму Саветам народных дэпутатаў, то, па-першае, ён павінен валодаць рэальнай уладай, а, па-другое, калі ен ёй валодае, дык у наяўнасці дваеўладзе у такім выпадку. А гэта ўсё роўна, што адсутнасць усялякай улады.

Аказваецца, усё куды больш проста. Райсавет надзяліў камітэт грамадскага самакіравання паўнамоцтвамі, у прыватнасці, правам праверкі дзейнасці прадпрыемстваў і ўстаноў, чым апошні і задаволіўся. Яшчэ б! З'яўляюцца зараз у любую арганізацыю такія вось «народныя прадстаўнікі» з патрабаваннем: «Ну-тка, пакажыце!..» І няхай кіраўнікі стогнуць, бо такія праверкі ўзрушаюць калектыў, зніжаюць яго працаздольнасць на дні і тыдні, па прычыне некампетэнтнасці правяраючых параджаюць чуткі і плёткі, затое захоўваецца бачнасць дэмакратыі. Адных гэта задавальняе тым, што не было ніякіх правоў — і раптам нейкія з'явіліся, а другіх тым, што «дзіця» цешыцца і не плача.

Але за кіраўніцтва раённым гандлем абедзве інстанцыі ўзяліся не жартам. І сапраўды, павінен жа быць нехта ў ролі «ахвяравальнага ягняці». А гандаль зараз - сфера самая ўразлівая: нідзе нічога няма, а калі і з'яўляецца нешта, то ўсім не хапае. Хто вінаваты? Вядома, гандляры. Там і карупцыя, і "блат", і падман.

Я далёкі ад таго, каб ісці ў адвакаты да работнікаў гандлю. Але барацьба за справядлівасць і законнасць не можа весціся несправядлівымі, а то і незаконнымі метадамі. З такой пастаноўкай пытання, высвятляецца, згодныя ўсе. І тым не менш...

З прэтэнзіямі глушчан да бытавога абслугоўвання вырашылі разабрацца такім чынам: правесці сход калектыву райбыткамбіната і паставіць на ім пытанне аб адпаведнасці займаемай пасадзе яго дырэктара. Бытавікі не пажадалі развітвацца са сваім кіраўніком, і яго пакінулі ў спакоі. Ні камітэт, ні райвыканкам ніякіх прэтэнзій больш не выстаўлялі. Іншая справа — кіраўнікі гандлю.

Праўда, такую выбарачнасць Віктар Уладзіміравіч Шчацько тлумачыць тым, што, скажам, за старшынёй праўлення райспажыўсаюза Папковым інтарэсы 11,4 тысячы пайшчыкаў, у той час, як за кіраўніком КБА толькі калектыў. Але з гэтай логікай наўрад ці можна пагадзіцца, бо ў добрай рабоце бытавікоў у роўнай меры зацікаўлены ўсе жыхары Глушчыны. А іх больш за пайшчыкаў. Аднак, думаецца, варта выслухаць аргументы абодвух бакоў: і старшыні праўлення райспажыўсаюза, і кіраўніка раённай савецкай улады.

— Думалі, што мітынговыя страсці улягуцца, — зазначыў старшыня райвыканкома В. У. Шчацько, — і можна будзе ва ўсім спакойна разабрацца. Але падзеі пачалі развівацца у іншым русле. Камітэт грамадскага самакіравання падаў заяўку на правядзенне раённай канферэнцыі пайшчыкаў і яшчэ аднаго мітынгу. Каб зрабіць усё ў рамках законнасці, вымушаны былі кансультавацца ў юрыдычным аддзеле Савета Міністраў рэспублікі. І вырашылі пачаць з нізоў, «пайсці ў народ», каб даведацца аб яго меркаваннях наконт даверу старшыні праўлення райспажыўсаюза. Зараз такія сходы праходзяць ва ўсіх гандлёвых аб'яднаннях і сельпо. Праўда, іх правядзенне ў прававых адносінах вельмі цяжка суадносіцца са Статутам спажыўкааперацыі. Але калі дзейнічаць строга па Статуту, то пайшчыкі наогул застаюцца ў баку ад абароны сваіх інтарэсаў. Таму мы вырашылі ўсё ж сходы праводзіць.

Што датычыць прэтэнзій да Рыгора Емяльянавіча Папкова на мітынгу, то яны ў многім абгрунтаваныя. Машыну, праўда, старую, але ж і за суму, якую можна назваць сімвалічнай, ён купіў. Гэта факт. Як факт і тое, што ніякіх юрыдычных норм пры гэтым не нарушана. Дом яму пабудавалі за сродкі спажыўкааперацыі. Але таксама з дазволу і ведама аблспажыўсаюза, які пераводзіў яго ў наш раён на работу з Кіраўска. Што ж датычыць дачы, то яе ў старшыні райспажыўсаюза няма. Будавалі дом для сям'і зяця за сродкі мясцовага аўтапрадпрыемства, дзе ён працуе шафёрам...

А вось меркаванні Р. Е. Папкова.

— На мітынгу, калі гучна крычалі «Далоў!», «Да адказнасці!»і я быў на трыбуне і чакаў тых прэтэнзій, на якіх і грунтаваліся гэтыя сур'ёзныя абвінавачванні і патрабаванні. Аднак нічога, акрамя пытанняў наконт курава, наконт таго, якую сям'ю лічыць мнагадзетнай і прадастаўляць ёй ільготы, і яшчэ некалькіх, не дачакаўся. Склалася ўражанне, што патрабуюць прыцягнуць да адказнасці, але не ведаюць, за што.

Між тым, райвыканком адразу павёў такую палітыку, каб старшыню райспажыўсаюза, паводле жадання мас, звольніць. Прычым, аргументы здаваліся нябітым козырам. Ёсць парушэнні ў гандлі? Ёсць. Як і усюды, яны зыходзяць ад нядабрасумленных людзей. Толькі летась мы больш за 50 чалавек пакаралі дысцыплінарна, 13 асуджаны народным судом.

Ездзілі работнікі райспажыўсаюза ў Польшчу? Ездзілі. А як я мог забараніць ім гэта? На законных падставах ездзілі, у лік або ў час водпуску. Дарэчы, медыкі і настаўнікі наведвалі Польшчу больш, але да іх прэтэнзіі ніхто не прад'яўляе, у віну ім гэта не ставіць.

Аб добрым таксама ніхто не ўспамінае. Колькі намаганняў старшыня райспажыўсаюза паклаў, каб стварыць матэрыяльную базу гандлю ў раёне. Аб тым, што зараз у нас незавершанага будаўніцтва на 15 мільёнаў рублёў, а весці яго вельмі няпроста, ніхто не дбае. Вось старую дабітую «Волгу», якую я два гады аднавіць не магу, успомнілі, катэджы ды дачы прыплялі...

Бачачы такую сітуацыю, я напісаў заяву аб вызваленні ад абавязкаў старшыні праўлення райспа-

жыўсаюза да бліжайшага паседжэння савета райспажыўсаюза, які, згодна са Статутам, выбірае старшыню, а таксама паўнамоцны пазбаўляць яго пасады.

Такі савет адбыўся. Прысутнічала на ім каля ста чалавек, хаця членаў савета абрана толькі 41 (удзел у галасаванні прынялі 36). Пасля справаздачы і абмеркавання прайшло тайнае галасаванне, пры якім 27 чалавек выказаліся за падтрымку старшыні райспажыўсаюза, а 9 — супраць. Прысутнічалі на пасяджэнні савета і члены камітэта грамадскага самакіраваняя. І пасля таго, як выйшла не па-іхняму, пачалася работа па фарміраванню недаверу ужо савету райспажыўсаюза, сталі праводзіцца розныя сходы пайшчыкаў, якія незаконныя, супярэчаць Статуту спажыўкааперацыі. Але на гэта ніхто ўвагі не звяртае...

Праўду сказаць, да аргументаў і таго, і другога я стаўлюся з пэўнай доляй скепсісу. У кожнага свая мэта, таму непрадузятасці чакаць не даводзіцца. Старшыня райвыканкома не хоча паўтарэння студзеньскіх падзей, бо невядома яшчэ, якія патрабаванні будуць у іх вылучаны. Ды і навошта людзей бударажыць. Ці не лепш кампрамісамі, супрацоўніцтвам дасягнуць узаемаразумення. Няхай нават у нечым парушаючы закон, ахвяруючы прынцыпамі ўлады.

Але ж выйграючы у адным, застаешся ў пройгрышы ў нечым іншым. Пагарджаючы законам, і да неразбярыхі недалёка.

У сваю чаргу, і старшыня праўлення райспажыўсаюза пакутуе ад пытання: чаму аб'ектам ахвяравання павінен быць ён? Хопіць таго, што звольнілі яго намесніка па гандлю А. С. Аўчыннікаву. Намесніка ж старшыні райвыканкома Л. А. Клыга сесія райсавета не вызваліла ад пасады, запатрабавала доказаў яе незаконных дзеянняў, хаця мітынгуючыя патрабавалі адстаўкі.

Карацей, у кожнага свае аргументы і факты. Адны здаюцца пераканаўчымі, іншыя — не вельмі. Асабіста я не лічу аб'ектыўным крытэрыем сходы пайшчыкаў, на якіх выносіцца вердыкт аб даверы або недаверы кіраўніку райспажыўсаюза. Вяскоўцы яго ў большасці і ў вочы не бачылі, як і многіх з раённага начальства. Паабяцай ім, што варта некага зняць з пасады — і адразу стане лепш жыць, многія прагаласуюць. Людзі стаміліся ад гаварыльні, абяцанняў, запэўніванняў.

Але пры ўсім тым, калі ацэньваць аб'ектыўна студзеньскі мітынг да лепшага змяніў грамадскую атмасферу ў раёне. Па-іншаму пачаў глядзець на кіруючыя кадры і райвыканком. У прыватнасці разабраліся з будаўніцтвам імі жылля. Высветлілася, што загадчыца аддзела культуры райвыканкома на дваіх з сынам, бо з мужам шлюб скасаваны, будуе дом плошчай 180 квадратных метраў, прычым за сродкі дзяржавы. Горш таго, каб не адабралі недабудаванае жыллё, хуценька яго прыватызавала, зразумела, па вельмі нізкай цане.

Выканком райсавета вынес рашэнне аб вызваленні яе ад займаемай пасады, скасаванні дагавору прыватызыцыі і высяленні з дома. Аднак сесія райсавета гэтае рашэнне не зацвердзіла, а справа аб высяленні дайшла да народнага суда. Відавочна, тут дэмакратыя скончылася: трэба і меру ведаць.

Да гонару, выканком і яго старшыня В. У. Шчацько справу не кідаюць. Займаюцца і іншымі праверкамі. Дзе ў саміх сіл не хапае, звяртаецца за дапамогай да кампетэнтных органаў. Вось такой бы абгрунтаванай і пастаўленай на падмурак законнасці рашучасці ва ўсім. Тады б і ўладу ўсе лічылі за сапраўдную. Без усялякіх дапаможных камітэтаў.

В. Кубека.

Пакуль гэты матэрыял рыхтаваўся да друку, рэдакцыі стала вядома, што старшыня праўлення райспажыўсаюза Р. Е. Папкоў звольніуся з пасады. Цікава, чыя гэта перамога: дэмакратыі ці раённага кіраўніцтва?

"Магілёўская праўда" 16.04.1992

ШИШ С МАСЛОМ И ПО СОБСТВЕННОМУ ЖЕЛАНИЮ

В январе 1992 года в Глуске, на площади Ленина состоялся митинг трудящихся. Присутствовало более 3000 человек. Поводом послужила голодовка, объявленная водителем горгаза Виктором Верига в знак протеста против действий председателя РПС Г.Попкова и его заместителя Е.Овчинниковой, а также редакции райгазеты «Радзіма», которая не опубликовала письмо Вериги. Кстати, по требованию автора и участников митинга письмо все же напечатали без всяких сокращений в №11 от 8 февраля.

На митинге выступающие вскрыли ряд грубейших недостатков в работе вышеуказанных потребсоюзов. Было решено провести собрание пайщиков РПС, которое и состоялось 2 февраля. Пришли 385 пайщиков, около 1000 трудящихся, представители 32 деревень района. И собрание, и митинг были единодушны в решении - освободить от занимаемых должностей и Попкова, и Овчинникову, и заместителя председателя райисполкома Клыгу за злоупотребление служебным положением.

Последнее выразилось в том, что все дефицитные товары они вместе с родственниками, знакомыми и работниками торговли вывозили в Польшу (об этом писала и райгазета 23 октября прошлого года). Из 63 человек, упомянутых там, некоторые ездили по 2-3 раза. Еще столько же руководителей предприятий ездили на служебных машинах или как кто сумел. Посчитайте, сколько вывезено и вывозится до сих пор товаров этими «туристами»-спекулянтами, которые нахватали добра еще до повышения цен, через черный ход.

Та же газета 12 февраля сообщила, что Попков и Е.Овчинникова подали заявления об освобождении от занимаемых должностей по собственному желанию. Правда, после слова «желанию» они добавили еще «до заседания совета потребкооперации»... Ловко, правда?

Была еще одна публикация в райгазете, 11 марта, под названием «Яшчэ адзін дзёвяты вал?» Наши уважаемые газетчики: редактор Матусевич и корреспонденты Чучвал и Коношевич рассказывали о предстоящем заседании Совета по-

требкооперации и советовали, «чтобы при голосовании «за» и «против» каждый вспомнил бурные январские дни». Наконец, последняя часть «потребительской эпопеи» в «Радзіме» появилась 21 марта. В заметке «Як і было задумана або Воран ворану вока не выклюе» отмечалось, что совет потребкооперации Глусского райпо 27-ю голосами «за» и 9-ю «против» восстановил Попкова Г.Е. в прежней должности.

Читаю список совета Потребкооперации и думаю: до какой же наглости, подлости и тупости дошла торговая мафия, она же хунта, она же бывшая партократия? Ведь в составе совета почти все - работники торговли, председатели сельсоветов, председатели колхозов, директора, экономисты и прочие коммунисты.

Делаю вывод: торговая мафия плюс бывшая партократия явно провоцируют трудовой народ на социальный взрыв, при котором может быть много крови, ибо народ возьмется за «даўбешкі» и с «даўбешкамі» в руках будет восстанавливать социальную справедливость.

27 казнокрадов и подхалимов - это люди, а народ с его трехтысячным митингом и собранием пайщиков с тысячей участников - это толпа, нелюди, рабы. По выражению члена совета потребкооперации, председателя Заволочицкого сельсовета Ф.Дудко, - это «шизофреники». Наверное, не один ящик водки да повышения цен по 10 рублей за бутылку получил этот человек от Г.Попкова.

У торговой мафии зажаты в кулаке все: и прокуратура с прокурором вместе, и милиция с начальником во главе, зато председатель райисполкома В.Щетько на собрании пайщиков голосовал за освобождение от должностей Попкова с Овчинниковой, и за недоверие и отзыв из депутатов зампредседателя райисполкома Л.Клыги.

Сейчас интенсивно обрабатываются трудовые коллективы района в поддержку Попкова. Дело подвигается туго. Повсеместно люди высказывают недоверие и ему, и его окружению.

Нужно тщательно проверить всю деятельность РПС, ибо по указанию Попкова магазины выдают людям по бутылке вина, а еще одну бутылку председатель заначивает. Еще несколько штрихов к портрету т.Попкова. На выборах в райсовет он набрал на один голос «за» больше, чем «против», и то благодаря двум голосам с соседнего участка. Авторитетом среди населения района не пользуется. Все руководители района куплены разными дефицитами, а трудовому народу остается шиш с маслом.

У моего соседа В.Незнанского молодая семья. Когда выпал снег, их мальчику пришлось идти в школу за 4 км в порванных кедах. А поляки благодарят наших торгашей...

На собрании пайщиков был избран комитет общественного самоуправления. По его инициативе были запланированы собрания пайщиков на предприятиях. Где бы они ни проводились, везде коллективы высказывают недоверие Попкову и Овчинниковой.

На 6 апреля было намечено собрание пайщиков на АП-15. Однако директор АП15 В.Лазаренко умышленно сорвал его: закрыл ленкомнату на замок, а сам специально уехал и приехал, когда люди уже разошлись. Оно и не удивительно, ведь зять Попкова возит на «Волге» директора Лазаренко...

Зато в районной поликлинике в тот день удалось провести собрание пайщиков. Оно единодушно выразило недоверие Попкову, Овчинниковой и Клыге, хоть главврач Ю.Захаров защищал Попкова изо всех сил Попкова... Еще бы, кум за кума тянет, кумовья ведь.

Г.ГРИГОРЬЕВ, ветеран труда, пенсионер, инвалид Отечественной войны II группы

P.S. Кстати, Попков - воспитанник того самого Мамчица из Кировского района...

ОТ РЕДАКЦИИ: Публикуя письмо Г.Григорьева и присланный им список совета потребительской кооперации Глусского района, мы хотим пригласить к открытому разговору на темы социальной справедливости в этом районе все заинтересованные, заинтригованные и т.д. стороны. Только так, устроив участникам своеобразную «Очную ставку» на страницах газеты, можно будет выяснить, кто мутит воду в глусском «водоеме».

P.P.S. Письмо печатается с небольшими сокращениями. Автор несет полную ответственность за точность указанных фактов и формулировок.

«На страже Октября» 7.05.1992 № 40

КОС УСТАНАВЛИВАЕТ КОНТАКТЫ

9 мая по приглашению областной организации Белорусского Народного Фронта группа членов Глуского районного комитета об-



На республиканской конференции по обсуждению экономической концепции БНФ. Слева направо: В. Верига, А. Фастовец, И. Кирин, З. Позняк. Минск. 9.05.1992.



У вечного огня на площади Победы.
Слева направо: З. Позняк, А. Фастовец, В. Голубев. Минск. 9.05.1992.

щественного самоуправления приняла участие в республиканской конференции по обсуждению экономической концепции, где встретилась с лидером БНФ Зеноном Позняком.

В этот же день глущане побывали в комитете общественного самоуправления одного из районов Минска «Уручье-1,2,3», председатель которого депутат Мингорсовета Николай Буснюк поделился опытом работы возглавляемого им КОСа, рассказал о деятельности других комитетов общественного самоуправления, которых в Минске насчитывется более 50, а также о подготовке республиканской конференции движения территориального самоуправления, которая должна объединить комитеты общественного самоуправления по всей республике.

И. Кирин



В комитете общественного самоуправления «Уручье-1,2,3».
Слева направо: И. Кирин, А. Фастовец, Н. Буснюк, В. Верига. Минск. 9.05.1992

ОБЪЯВЛЕНИЕ

Если вас необоснованно уволили с работы, задержали выплату зарплаты, отказали в рассмотрении обращения, если нарушили ваше право, установленное Конституцией и законами – обращайтесь в общественную приемную Белорусского Хельсинкского Комитета.

Контактный телефон: 41522 (Игорь Кирин)

Желающих регулярно получать «Глускую панораму» просим сообщить об этом в редакцию газеты.

№ 5-6 (57-58)
Февраль 2009 г.
Глуская ПАНОРАМА

Общественно-политическая газета.
Выходит с июля 1998 г. Редактор - Игорь Кирин.
Адрес для писем: 213879, г.п. Глуск, ул. Кирова, 43-18.
Тираж - 150 экз. Тел. 41522. E-mail: glu-cl@mail.ru
http://www.gluskonline.net